- выполнили спортивный разряд 3,6 % респондентов-юношей.

Основными причинами, мешающими заниматься ФСД, названы: отсутствие свободного времени – 51,9 % (юноши – 54,5 % и девушки – 58,2 %); нет секции по любимому виду спорта в вузе – 9,2 % (юноши – 10,0 % и девушки – 8,7%); слабая организаторская работа – 8,2 % (юноши – 10,0 % и девушки – 7,1 %); отсутствие инвентаря и спортивной формы – 7,8 % (юноши – 14,5 % и девушки – 4,1 %); нежелание заниматься физкультурой – 7,2 % (юноши – 2,7 % и девушки – 9,7 %); слабое здоровье у 9,7 % девушек-участниц исследования.

Здоровый стиль жизни (ЗСЖ) – сложившиеся и актуализированные личностью формы и способы жизнедеятельности, не противоречащие требованию сохранения и укрепления здоровья человека, его духовных и нравственных кондиций. Здоровый стиль (образ) жизни для опрошенных студентов включает такие аспекты, как (см. табл. 8):

***Таблица 8***

| Здоровый стиль жизни для вас это: | *Всего ответили* | **В том числе:** | |
|---|---|---|---|
| | | **юноши** | **девушки** |
| 1. Гигиена тела | **58,8%** | 53,6% | 61,7% |
| 2. Занятия спортом | **68,6%** | 86,4% | 58,7% |
| 3. Правильное питание | **73,2%** | 63,6% | 78,6% |
| 4. Отказ от вредных привычек | **61,1%** | 60,0% | 61,7% |
| 5. Тестирование физической подготовленности | **2,0%** | 4,5% | 0,5% |
| 6. Наблюдение за состоянием здоровья | **17,0%** | 15,5% | 17,9% |
| 7. Соблюдение режима дня | **11,4%** | 10,9% | 11,7% |

Из таблицы видно, что более 60 % студентов стремятся избавиться от вредных привычек. В то же время по данным исследований курит 22,5 % студентов, употребляют алкоголь редко, по праздникам 66,3 % опрошенных (юноши – 60,0 % и девушки – 69,9 %), употребляют алкоголь умеренно, 1 раз в неделю – 10,1 % (юноши – 16,4 % и девушки – 6,6 %), не отказываются, когда предлагают выпить 10,0 % юношей.

Усталость студентов по дням недели следующая: больше всего устают в понедельник – 34,3 % (юноши – 40,9 % и девушки – 30,6 %), в пятницу – 26,1 % (юноши – 20,9 % и девушки – 29,1 %), в среду – 17,3 % (юноши – 12,7 % и девушки – 19,9 %), в четверг – 8,5 % (юноши – 10,9 % и девушки – 7,1 %), во вторник – 5,6% (юноши – 5,5 % и девушки – 5,6 %), в субботу – 4,6 % (юноши – 5,5 % и девушки – 4,1 %), в воскресенье – 1,3 % (юноши – 1,8 % и девушки – 1,0 %).

Опрошенные студенты оценивают свой стиль (образ) жизни следующим образом: 1 балл – 2,3 %, 2 балла – 12,7 %, 3 балла – 37,9 %, 4 балла – 42,8 %, 5 баллов – 4.2 % респондентов.

Таким образом, студенты многие проблемы развития своего умственного, интеллектуального и физического развития сводят к проблеме нехватки свободного времени. В этом аспекте важным представлен вопрос о возможных занятиях при наличии большего количества свободного времени (см. табл. 9).

***Таблица 9***

| Если, предположим, у Вас станет больше свободного времени, чем Вы будете заниматься после учебы? | *Всего ответили* | **В том числе:** | |
|---|---|---|---|
| | | **юноши** | **девушки** |
| 1. Более активно участвовать в общественной работе | **11,4%** | 13,6% | 10,2% |
| 2. Больше читать литературу | **38,2%** | 21,8% | 47,4% |
| 3. Больше заниматься спортом | **45,1%** | 55,5% | 39,3% |
| 4. Чаще ходить в кино, театр, смотреть телевизор | **27,8%** | 10,9% | 37,2% |
| 5. Чаще выезжать на природу | **45,4%** | 4,0% | 48,5% |
| 6. Чаще встречаться с друзьями | **65,4%** | 60,9% | 67,9% |
| 7. Отдыхать, ничего не делая | **18,3%** | 17,3% | 18,9% |
| 8. Заниматься на компьютере, использовать Интернет | **18,3%** | 28,2% | 12,8% |
| 9. Проводить время в кафе, на дискотеке | **28,4%** | 23,6% | 31,1% |

В целом по университету наблюдается тенденция снижения показателей физической подготовленности студентов. Основными причинами такого спада являются низкие физические данные абитуриентов, поступающих в университет, недостаточная мотивация студентов на физкультурно-спортивную деятельность.

***Заключение:***

1. Лишь небольшая часть студентов рационально использует свободное время;
2. Большинство студентов положительно оценивают занятия физкультурно-спортивной деятельностью;
3. Физическая культура и спорт привлекают студенческую молодёжь, прежде всего, как специфическая сфера деятельности, в которой можно отдохнуть, развлечься, укрепить здоровье, поднять свой престиж. Значительно реже студенты оценивают физическую культуру как средство развития личности, понимают физическую культуру как вид личностной культуры;
4. Физкультурная образованность и грамотность студентов часто бывает поверхностной;
5. Примерно у половины студентов не сформирован ЗОЖ, и они не имеют неполные и поверхностные представления о нем;
6. Работа по пропаганде ЗОЖ в вузе требует дальнейшего совершенствования. Физкультурное воспитание часто сводится к организации практических занятий.

*Материал поступил в редакцию 14.10.09*

**MOISEYCHIK E.A., ZUKOVEC V.I. Healthy image of life in system of modern education: problems, decision and prospect**

The problems of the roll of physical training and its place in the system of modern education as well as in the rational usage of free time by students are studied. Sociological data on the attitude of students to physical training and sports in free time are stated with the students of Brest State University and Brest Technical State University taken as an example.

УДК 821.161.3. + 82-15

***Борсук Н.М.***

# КАНЦЭПТ АСОБЫ І ГРАМАДСТВА (паводле творчасці М. Пракаповіча)

**Уводзіны.** Як сведчыць гісторыя, любое грамадства ў першую чаргу хвалююць пытанні матэрыяльна-тэхнічнага, навуковага, палітычнага, рэлігійнага характару. Хараству доўгі час адводзілася другарадная роля. Нават Гегель, які прысвяціў шэраг прац пытанням эстэтыкі, абмяжоўваў «царства прыгожага» галіною мастацтва [1, с. 7]. Сучасныя грамадскія працэсы пераконваюць, што на сённяшні дзень праблема маральна-этычнага вопыту ўдасканалення грамадства і асобы павінна стаць ключавой.

***Борсук Ніна Мікалаеўна,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры замежных моў эканамічных спецыяльнасцей Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.*
*Беларусь, г. Брэст, БрДТУ, 224017, вул. Маскоўская, 267.*

«У жыцці грамадства ёсць перыяды, калі этычнае і эстэтычнае збліжаюцца, а ёсць моманты іх аддалення. Збліжэнне наступае тады, калі абнаўляецца грамадства і ўся сістэма каштоўнасцей знаходзіцца ў руху, а ў часы застояў краса і дабро разыходзяцца, краса становіцца геданістычнай і распуснай, а мараль – драпежнай і цынічнай» [2, с. 8]. Вось чаму сучасныя паэты імкнуцца праз паэтычнае слова згарманізаваць няпросты і шматаблічны свет.

На наш погляд, тонка адчуў і акрэсліў вызначальную рысу сучаснай паэзіі А. Лойка: «Не сама краса становіцца зместам паэзіі сучасных мастакоў слова, а гуманізм адносін іх да жыцця» [3, 1, с. 22]. Гэтая якасць, бясспрэчна, уласціва і творам М. Пракаповіча. Значным набыткам па вывучэнні творчасці прадстаўніка інтэлектуальна-філасофскай плыні сталі працы У. Калесніка [4], [5], З. Мельнікавай [6], В. Ляшук [7] і інш. У прадстаўленым даследаванні акцэнт робіцца на творчых набытках паэта-земляка ў аспекце актуальнай праблемы ўзаемаадносін чалавека і грамадства.

М. Пракаповіч тонка адчувае пульсацыю жыцця мінулага, сучаснага і будучага, трывалую сувязь пакаленняў. Лірычны герой паэта ўпэўнены: «Цяжка падняцца ў атаку, / калі за спіной – / пустата...» (верш «Шляхі»). Зварот да гістарычнага мінулага, на думку нашага сучасніка, будзе спрыяць руху наперад. Асэнсоўваючы асноўныя вехі развіцця краіны ў вершы «Шляхі», М. Пракаповіч вылучае гістарычныя падзеі, якія адыгралі важную ролю на шляху беларусаў да волі і нацыянальнай кансалідацыі. Першай вызначальнай падзеяй ён лічыць Грунвальдскую бітву, пасля якой больш чым на пяцьсот гадоў была спынена нямецкая экспансія на Усход.

Далей М. Пракаповіч называе 1863 год. Наследаванне фальклорным традыцыям (паралелізмы, лексіка-інтанацыйныя паўторы, фальклорная сімволіка) дапамагае аўтару наблізіць да чытача жывое, трапяткое слова Кастуся Каліноўскага. М. Пракаповіч здолеў таленавіта перадаць асноўную ідэю запавету К. Каліноўскага, для якога галоўным было не выжыць, а перамагчы ворага – расійскі царызм, дамагчыся, каб ніхто ніколі не панаваў над беларусамі, над родным краем. Апошняе двухрадкоўе «Можа, не ўсе мы выстаім, / але Беларусі – жыць!» сугучна з развітальным словам кіраўніка паўстання: «Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, тагды толька зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе» [8, с. 22].

Думка К. Каліноўскага аб барацьбе народа за свае правы ажывае ў паэтычнай і публіцыстычнай спадчыне яго ідэйных пераемнікаў. У брашуры «Братья-чехи» М. Багдановіч нагадвае пра цярністы шлях братняга народа – чэхаў, якія прыйшлі да ўсведамлення, што «яны – славяне, але толькі анямечаныя; яны зразумелі, што роднай мовай для іх павінна быць мова чэшская. Яны пачалі вучыцца чэшскай мове, навучаць на ёй сваіх дзяцей, пісаць на ёй кнігі, друкаваць газеты, дабівацца для яе правоў у дзяржаве»[9, 3, с. 76]. Як бачна, гістарычная памяць вяла чэшскі народ па шляху нацыянальнага адраджэння.

Складанымі формамі памяці, як нам вядома, валодаюць нават птушкі. Гэта дазваляе іх новым пакаленням ажыццяўляць пералёты ў звычайным для іх накірунку да родных гнёздаў. Аб гэтым пісаў яшчэ на мяжы XI і XII стагоддзяў Уладзімір Манамах у сваім «Павучанні». Толькі дзякуючы памяці, мінулае трывала ўваходзіць у сучаснасць, а будучае як бы прадугледжваецца ім і яднаецца з мінулым у адзіную жыццёвую плынь. Ідэя гістарычнай пераемнасці становіцца скразной у творчасці М. Пракаповіча, у прыватнасці, у кнізе «Мяжа надзеі». Нізкі вершаў «Абрысы», «Галасы берасцейскага дзядзінца» – важны этап у спасціжэнні творцам пераменлівага свету, у разуменні дынамікі часу. Вызначыць сэнс імгнення быцця – вось задача, якую ставіць перад сабой наш сучаснік. Пунктам адліку на гэтым шляху для яго з'яўляецца любоў да роднай зямлі. Пераасэнсаваўшы добра вядомую прымаўку «адзін у полі не воін», М. Пракаповіч у вершы «Прашчур» сцвярджае, што і адзін здольны абараніць сваю Радзіму ад духоўных чужынцаў, калі ён «душою сваёй і целам зросся» з роднаю зямлёю: «Адзін у полі – не воін, / калі гэта поле – чужое. / Устану ў полі / адзін я, / калі гэта поле – / Радзіма» (верш «Прашчур»).

Трывогі сённяшняга дня М. Пракаповіч асэнсоўвае ў повязі часоў, у дыялектыцы іх пераемнасці і абнаўлення. Так, у вершы «Ісціна», прысвечаным земляку з вёскі Лышчыцы, беларускаму мысліцелю Казіміру Лышчынскаму, слова «ісціна» выступае як бы ў трох вымярэннях. Паэт нагадвае чытачу пра трагічны шлях беларускага асветніка, які ўсё сваё жыццё шукаў ісціну. «Стагоддзі пройдуць – што ў іх зменіш ты?» – гэтая думка не пакідае лірычнага героя М. Пракаповіча. Паняцце ісціны асацыіруецца для яго з рухам наперад: «У ісціны заўжды адно імя / І сцяг адзін, і шлях адзін – наперад». Хаця ён разумее, што на гэтым шляху будуць расчараванні, непаразуменні, кроў. Ці не таму: «ісціна паходняю палае...». «У сваім XX ст. мы сталі спадчыннікамі не толькі светлага Адраджэння, але куды ў большай прапорцыі пераймальнікамі каварства і цемры, езуіцтва і інквізітарства» [10, с. 92]. Трагедыя наша ў тым, перакананы А. Лойка, што «светлата Адраджэння» выхавала ў беларусаў даверлівасць, часта да наіўнасці, самаўпэўненасць, «якая ў сваю чаргу спарадзіла пераацэнку сіл і моцы светлаты, недаацэнку сіл каварства, маральнай ніцасці. З пераацэнкі – культ, з недаацэнкі чалавека – чалавек-вінцік. Культ – гэта беззаконне. Беззаконне – рэпрэсіі, калі даверлівы – падмануты, самаўпэўнены – самападмануты» [10, с. 92].

Пошук ісціны для сучаснікаў М. Пракаповіча адначасова ўяўляецца шляхам асэнсавання трагічнай гісторыі беларускага народа. Нягледзячы на тое, што «бязвер'е цяжка веру набывае», лірычны герой М. Пракаповіча здолеў усвядоміць гэтую ісціну, знайшоў у сабе сілы парваць, вобразна кажучы, «нерат жыцця». Гэты вобраз-сімвал перадае замкнёнасць свету, які аблытаны завесаю хлусні, страху, недаверу.

Па гэтай прычыне М. Пракаповіч у вершы «Шляхі» прыгадвае не толькі ўзнёслыя, але і трагічныя даты нашай гісторыі. Напрыклад, 1937 год – час, калі панаваў данос, страх, духоўны і фізічны гвалт. Паэт перакананы, што аб'ектыўная ацэнка падзей 30-х гадоў мінулага стагоддзя ў нашай шматпакутнай гісторыі дапаможа сучаснікам пераадолець «генетычны страх», што накапіўся ў «няшчасных душах» нашчадкаў. Да гэтай думкі набліжае нас М. Пракаповіч вершам «Лірнік». Паэт заклікае сучасніка: «Не палохайся», «душы не прадавай», бо толькі тады «ўся мінуўшчына сцяной / Устане за тваёй спіной» (верш «Лірнік»).

Прыём кантамінацыі фальклорнага тэксту ў вершы «Доля» (тройчы паўтараюцца радкі з народнай песні – «А я долю, сваю долю...»), прысвечаным Паўлюку Багрыму, спрыяе замацаванню матыва сувязі часоў. У беднага хлопца няма шчасця, добрага лёсу: яго чакае паншчына, рэкрутчва – адна няволя: «А я долю, сваю долю / Закапаю ў чыстым полі...». Герой марыць вырвацца на волю, да шчасця. Хлопец, лірычны герой верша, прыходзіць да высновы, што гору не будзе канца, пакуль чалавек не навучыцца супрацьстаяць антычалавечым умовам жыцця. Мару аб вольнай, шчаслівай долі П. Багрым увасобіў у жырандолі, што зрабіў сваімі рукамі. «А я долю, сваю долю / Жаўруком пушчу на волю...». У трэці раз, паўтарыўшы радок «А я долю, сваю долю...», М. Пракаповіч запрашае чытача да разваг аб лёсе народных талентаў ва ўмовах духоўнага і фізічнага гвалту.

Пазіцыя чалавека, што стаіць на мяжы з мінулага ў будучае, знаходзіць у паэзіі М. Пракаповіча маральна-філасофскае асэнсаванне. Духоўная сіла чалавека, паводле канцэпцыі паэта, – у яго самааддачы, у яго стваральнай актыўнасці. У вершы «Лірнік»яна лаканічна выражана ў катэгарычным сцвярджэнні: «не адракаюся». У словах ветэрана (верш «Ветэран») – «Радзіма пачынаецца з праўды» – выразна акрэслены крытэрый, з якім паэт і яго лірычны герой уступаюць у XXI стагоддзе.

Сімвалічная вобразнасць, надзвычай характэрная стылю М. Пракаповіча, паглыбляе філасофска-маральныя аспекты яго творчасці. У вершы «Цытадэль» паэт праз удала знойдзены вобраз-сімвал – «бяздонныя жоўтыя вочы ўдава» – сцвярджае, што сустрэча са смерцю не павінна ператварыць асобу ў абыякавую, жорсткую істоту. Ён паэты-

зуе душэўную чуласць, заклапочанасць маладога бязвусага лейтэнанта, які цаной свайго жыцця дае коням надзею на выратаванне.

У вершы «Вяртанне» пераасэнсоўваецца традыцыйнае значэнне крыжа. У народных уяўленнях гэты вобраз найчасцей сімвалізуе цяжкі лёс, «той, каторы наканавана / Нам усім да скону нясці», пакуты, слёзы, якія, асабліва ў хвіліны адчаю, гнуць «невыносным цяжарам» да зямлі. Але ў названым вершы, калі лірычнаму герою здаецца, што боль, цемра заслоняць усё светлае ў жыцці, «з крыжа вырастаюць крылы, / Каб узняць цябе над зямлёй». Імкненне чалавека да святла, да неба мацнейшае за жыццё. Гэтая думка скразной лініяй праходзіць праз верш «Вяртанне»: «Не зламацца... Хапіла б сілы / Дачакацца зоркі сваёй». З гэтаю мараю жыў М. Агінскі, аўтар славутага паланеза, удзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, наш знакаміты зямляк, якому М. Пракаповіч прысвяціў верш з даволі сімвалічнай назвай – «Вяртанне». Паэт у ім вяртае надзею свайму сучасніку на адраджэнне роднага краю. Таму і заканчваецца верш радкамі: «...Раскажы мне, надзея, казку, – / Абнадзей мяне, абнадзей...» (верш «Вяртанне»).

Пры асэнсаванні сучаснасці выявілася вельмі важная рыса творчасці М. Пракаповіча – дыялектычнасць мыслення, якой часам не хапае маладым паэтам. Думаецца, гэтаму наш сучаснік вучыцца ў М. Багдановіча. «Шматграннасць адчування жыцця, разуменне дыялектыкі развіцця – вось што нараджала магутнасць духу Багдановіча, жывіла яго веру» [11, с. 54]. Гэтая думка выразна акрэслена ў вершы беларускага класіка «Летапісец»: «... і згінуў іх народ. / І ўсё змянілася, і ўжо пра іх забылі. / Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі! / І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх, / Аб горы, радасцях і аб прыгодах іх, / Каму маліліся, чаго яны шукалі...» Вера М. Багдановіча ў народ, які здольны ўзняцца праз вяртанне да сваіх вытокаў, не пакідае нас абыякавымі.

Зборнік «Мяжа надзеі» сведчыць, што і М. Пракаповіч дапытліва асэнсоўвае гісторыю роднай зямлі, ён уважлівы да кожнай дробязі. Меч, дубовае рала, чоўнік, самшытавы грабеньчык, знойдзеныя ў час раскопак на тэрыторыі старажытнага Берасця, цікавяць паэта, прымушаюць актыўна працаваць уяўленне не толькі таму, што за кожнай рэччу стаіць лёс канкрэтнага чалавека, – аратага з мазолістымі рукамі, яго сынка-стрыгунка, што прымяраецца да цяжкіх ручак ралы, закаханай дзяўчыны, што валасы расчэсвала грабеньчыкам на світанні... За абліччам даўніх прашчураў ён убачыў вытокі нашага жыцця.

Такім чынам, М. Пракаповіч не гаворыць адкрыта аб тым, што час незваротны, хуткаплынны і што марная трата яго не што іншае, як абкрадванне самога сябе. Аднойчы паэт знайшоў зручную для мастака пазіцыю – на мяжы мінулага, сучаснага і будучыні – і вось ужо на працягу многіх гадоў, зыходзячы з яе, аглядаецца вакол. У вершы, прысвечаным А. Філіповічу, аўтар акрэсліў гэтую пазіцыю наступнымі радкамі: «...Прарастаюць вечных ісцін дрэўцы / З незабытых праведных магіл» (нізка вершаў «Галасы берасцейскага дзядзінца»).

Таленавіта паэтызуе наш сучаснік постаці знакамітых землякоў. Герой зборніка «Мяжа надзеі»з уздзячнасцю ўспрымае запаветы А. Філіповіча: «Вольнасці не купіш і за грошы», «Хоць бяда – сказаць у поўны голас, / Ды бяда – паслужліва маўчаць» (нізка вершаў «Галасы берасцейскага дзядзінца»). А сваю веру, упэўненасць, што «душы празрэюць у нас для саўбы» (паэма «Прыходзіў час»), паэт укладвае ў вусны Кірылы Тураўскага, асветніка, які ў сваіх словах-казаннях уздымаў праблемы духоўнай дасканаласці суайчыннікаў. Вершы-прысвячэнні У. Калесніку, М. Купрэеву, М. Вайцяхоўскаму, П. Данелію, С. Свістуновічу, М. Кузьмічу, Л. Зізанію, А. Філіповічу і інш. успрымаюцца чытачамі як адказ на пытанне Кірылы Тураўскага: «Дзе вы, спадзвіжнікі і вучні? / Дзе вы, апосталы народа, / Гатовыя ўзысці на крыж?» (паэма «Прыходзіў час»). М. Пракаповіч разважае аб непадзельнасці лёсаў гэтых людзей і Бацькаўшчыны.

«Кожны чалавек з'яўляецца вучнем якога-небудзь глыбокага слова» (эпіграф да цыкла «Думы»). Актуальнасць гэтага перакананя М. Багдановіча адчулі і паслядоўна рэалізуюць у сваёй творчасці нашы сучаснікі. Як і беларускі класік М. Пракаповіч не жадае «стварацць сабе куміраў», таму змест нават вершаў-прысвячэнняў ён падначаліў раскрыццю агульнагуманістычных ідэй нацыянальнага адраджэння, духоўнага ўзвышэння асобы. Аб гэтым сведчаць і вершы, прысвечаныя У. Калесніку.

У вершы «...І нараджалася слова» М. Пракаповіч разважае аб сэнсе чалавечага існавання. Ён выразна акрэслівае дылему, якая час ад часу паўстае амаль перад кожным: што абраць – спакойнае абывацельскае шчасце альбо нястомнае, актыўнае падзвіжніцтва. «Там – мяжа. / І надзея – стрыножана; / Плавіў долю, а выплавіў шлак», – у такім становішчы можа апынуцца чалавек, які выбраў першы шлях. Але інакшай бачыцца жыццёвая мяжа таму, хто пастаянна ў паходзе, хто ідзе да сваёй мэты ад вытокаў да вусця. Менавіта такі шлях быў абраны Уладзімірам Андрэевічам: «Ёсць яна, веры аснова, / Не сыдзе ўсё ў прах і дым! / ...І нараджалася СЛОВА / У змучаным сэрцы тваім. / Ты нёс яго праз пагарду, / Праз здраду, дзяржаўны сверб. / Моц незямнога гарту – / Юначых вачэй давер. / Магчыма, не велькі гонар – / Выкладчык тутэйшых школ. / Ды неўміручым звонам / СЛОВА / гучыць вакол».

Сёння да гонару паэта неабходна адзначыць, што, калі б давялося яму адказваць на пытанне У. Калесніка «Усё чалавечае – з вамі?», – то не хаваў бы вачэй ні Мікола Пракаповіч, ні яго аднадумцы: «Мы шлях выбіралі самі, / Акрыленыя яшчэ... / У вочы ўзіралася Памяць: / Усё чалавечае – з вамі? / І мы не хавалі вачэй» (верш «Шляхі»).

У. Калеснік годна крочыў па беларускім шляху. Ён шмат зрабіў для развіцця культуры і літаратуры на Берасцейшчыне, лёс з якой звёў нашага настаўніка ў 1954 годзе. Шмат намаганняў прыклаў У. Калеснік для плённай працы берасцейскага літаратурнага аб'яднання, якое з яго лёгкай рукі стала называцца «Берасцейскае вогнішча». Сёння правамерна сцвярджаць, што скрыты этап беларускага нацыянальнага адраджэння праходзіў у Берасце пад «сцягам У. Калесніка».

Шлях духоўнага адраджэння беларусаў ад бязвер'я, бяспамяцтва, абыякавасці да будучыні сучасныя паэты звязваюць з адносінамі народа да роднай мовы – «душы Айчыны»: «Жывы народ, пакуль жывое / Слова. / Крыніцаю / з-пад глею і жарствы / Адродзіцца / праз ваш ратунак мова, – / Адродзіцеся / з роднай мовай вы!» (М. Пракаповіч «Запавет»). Такой бачыцца М. Пракаповічу перспектыва гістарычнага развіцця, выспяванне нацыянальнай свядомасці беларуса. Праблему мовы паэт закранае ў вершы-прысвячэнні М. Багдановічу «Як чакаў ты гэтае сустрэчы». Няўтульна стала б М. Багдановічу, мяркуе лірычны герой М. Пракаповіча, у яго «краіне-браначцы». Ён жахнуўся б ад «трасянкі», на якой размаўляе палова сённяшніх беларусаў. Таму і пытае з роспачу, болем і крыўдай М. Пракаповіч: «Ці захочацца спаткацца з намі? / Ці пазнаеш свой народ, Паэт?». Пастаўленыя пытанні ўяўляюцца пераасэнсаваннем багдановічаўскага радка «Я хацеў бы спаткацца з вамі...», які выкарыстаў М. Пракаповіч у якасці эпіграфа да верша.

У адрозненне ад свайго сябра М. Пракаповіча, А. Каско заняў супрацьлеглую пазіцыю. Паэт перакананы, што М. Багдановіч захацеў бы сустрэцца са сваімі нашчадкамі. Гэтую думку ён узмацняе праз увядзенне ў верш «Багдановічу» радка: «Я хацеў бы спаткацца з Вамі...». Наш сучаснік радуецца, што расце цікавасць да гісторыі народа, таму і лічыць, што прыйшоў час для глыбокага, абноўленага асэнсавання спадчыны М. Багдановіча.

Спадчына беларускага класіка дапамагае сёння не траціць надзею і веру, што «яшчэ адзін народ не знікне з твару зямлі, што не змарнатравіцца бясследна велізарная псіхічная праца многіх пакаленняў і беларуская культура – стварэнне гэтай працы – устаіць супроць напору іншых сіл і плыняў» (артыкул «Беларусы»). Гэтая думка-мара М. Багдановіча здаецца канцэптуальна важнай у кантэксце даследавання.

Беларуская мова, культура, па трапных назіраннях М. Багдановіча, «не з'яўляецца варыянтам велікарускай. Перад намі знаходзяцца два самастойныя культурныя комплексы, якія ад самага ж пачатку раслі і развіваліся незалежна адзін ад аднаго» (артыкул «Беларусы»). Аднак герой М. Пракаповіча хвалюецца, што нашчадкі «разнясуць» беларускую мову «па мовах іншых, / У чужыя, лепшыя

куткі?» (верш «... І нараджалася слова»). На мову М. Пракаповіч глядзіць як на вялікі скарб, дарунак Бога, матэрыяльна прадстаўлены, выпакутаваны, здабыты болем і крывёй папярэдніх пакаленняў. Яго ўяўленне аб «долі людскай» асацыіруецца з гаворкаю на роднай мове, з імёнамі людзей, што прысвяцілі сваё жыццё служэнню Бацькаўшчыне. Таму пытанне аб адраджэнні роднай мовы паэт закранае ў вершах, прысвечаных славутым сынам беларускай зямлі: Васілю Цяпінскаму, Усеваладу Ігнатоўскаму, Максіму Багдановічу, Уладзіміру Калесніку...

Слова здольна параніць чалавека, а можа і выратаваць яму жыццё. Лірычнаму герою зборніка «Мяжа надзеі» здаецца, што беларуская гаворка здолее вярнуць да жыцця У. Ігнатоўскага: «І на чырвоны снег / Я выпаўзу – / па-беларуску / Хоць слова скажыце мне» (верш «Воўк»). Чытачу імпануе пазіцыя сучаснага паэта, які адраджэнне роднага краю не ўяўляў без сцверджання самабытнасці духоўнай спадчыны беларусаў, і ў першую чаргу, роднай мовы: « Ды што сказаў бы продак, не ўяўляю, / І як бы ў неба літасці прасіў. / Калі б убачыў, што акраса краю / Забрана ці загублена зусім?!» (верш «Запавет»).

Сорам, сум і боль адчувае лірычны герой верша «І нараджалася слова» М. Пракаповіча, бо дзеці беларусаў у пачатку XXI ст. на роднай мове могуць толькі «адно прачытаць ледзь-ледзь».

Праз трапныя параўнанні ў вершы «Запавет» паэт характарызуе памкненні, жыццёвыя прынцыпы «духоўных пастыраў» – людзей, якія павінны спрыяць ўзнаўленню беларускай культуры: «І веру памяняюць, як апратку, / Ўсё прададуць за сытае ярмо», як «пастухі, / за статкам / Яны плятуцца з пугамі прамоў». Вышэй працытаваныя радкі сугучны вытрымцы з артыкула М. Багдановіча «Голос из Белоруссии»: «Выцясняючы беларускую мову са школы, мы вядзем да растраты вынікаў аграмаднай, шматвяковай духоўнай работы цэлага народа, збіваем думку дзіцяці са звыклых псіхалагічных сцяжынак і груба ўрэзваем яго душэўны свет; уводзячы ж мову велікарускую, мы ставім на яго шляху шэраг перашкод, засяляем яго псіхіку вобразамі змярцвелымі, няяснымі і ў многіх выпадках зусім недарэчнымі» [9, 3, с. 202]. Зварот да рускай мовы замест роднай, па трапнай заўвазе М. Багдановіча, раўназначны таму, што даваць маленькаму неразумнаму дзіцяці «замест хлеба камень і замест рыбы вужаку» (артыкул «Голос из Белоруссии»).

Для нашага сучасніка М. Пракаповіча раўнацэннымі з'яўляюцца такія паняцці, як «мова»і «матуля»: «Мова, як матуля, ў нас – адна» (верш «... І нараджалася слова»). Усведамленне гэтай простай ісціны дасць мажлівасць беларусам, па перакананні паэта, не адчуць, што на роднай зямлі яны «без племені і роду жабракі» (верш «Запавет»).

Апорным словам у развагах М. Пракаповіча аб лёсе беларускага народа на роднай зямлі, як бачна, стала слова «жабракі». Яно сэнсава сугучнае з хваляваннем А. Каско за будучыню роднай Беларусі, увасобленым у словазлучэнні «вера авечая» (верш «Шчэ іду, шчэ начую ў капе я»), у слове «натоўп» (верш «З размовы анёлаў у небе над Беларусьсю»); са шчымлівым перажываннем М. Купрэева, які называе Бацькаўшчыну «харошай авечай зямлёй». Але ў цэлым роздум нашых сучаснікаў аб будучыні беларускага народа не ўяўляецца песімістычным. На іх думку, менавіта перад мастакамі слова, «ахвярнікамі», стаіць важная задача – вывесці свой народ са стану абыякавасці, забыцця. У гэтым прызначэнне творцы (верш «Майстэрня» А. Каско).

М. Пракаповіч шукаў і шукае выйсце з сітуацыі, калі на роднай зямлі кожны «ні гаспадар, ні слуга: «Няўжо табе не ўваскрэсці, / Радзіма, – з глухой нематы?» Трывогу за лёс Бацькаўшчыны, якую паэт атрымаў ад продкаў, ён перадае ў спадчыну сыну: «Усё, што называецца Радзімай, няхай цябе ніколі не міне» (вершы «Пытанне сына», «Дзве размовы з сынам пра Радзіму»). Такім чынам, заслуга М. Пракаповіча і яго аднадумцаў заключаецца ў тым, што яны сваёй творчасцю вяртаюць «натоўпу» самасвядомасць народа.

**Заключэнне.** Як бачна з праведзенага аналізу, характэрная рыса светаадчування лірычнага героя М. Пракаповіча – уяўленне аб жыцці як аб цыклічным працэсе. Нашага сучасніка хвалюе не столькі кругагзварот ў прыродзе, колькі ў грамадстве, дакладней – у царстве духу. Схільнасць сучаснага паэта да гэтай філасофскай канцэпцыі тлумачыцца некалькімі прычынамі. Беларускае адраджэнне ў чарговы раз пайшло на спад, а «ўраджай на цыклічныя тэорыі становіцца асабліва багатым пасля чарговага краху спроб ідэальнага пераўладкавання свету» [12, с. 186]. І гэта, відавочна, першая прычына.

Па-другое, паэзія М. Пракаповіча пераконвае чытача, што можна рухацца мэтанакіравана, гарманічна, упэўнена, толькі ўсвядоміўшы гістарычны, духоўны вопыт свайго народа. Невыпадкова мастак слова трывогі сённяшняга дня асэнсоўвае ў сувязі часоў, у дыялектыцы іх пераемнасці і абнаўлення. Змест яго вершаў-прысвячэнняў знакамітым землякам падначалены духоўнаму ўзнаўленню асобы, непадзельнасці лёсу чалавека і Бацькаўшчыны.

Канцэптуальны аналіз паэзіі М. Пракаповіча, праведзены ў аспекце актуальнай праблемы ўзаемаадносін асобы і грамадства, сведчыць аб уздзеянні асобы М. Багдановіча, У. Калесніка і іх творчых традыцый на працэс афармлення паэзіі нашага земляка ў паўнавартасную прафесійна-мастацкую сістэму – самакаштоўны феномен духоўна-інтэлектуальнага жыцця нацыі і чалавецтва.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Гегель, Г.В.Ф. Эстетика: в 4 т. / Г.В.Ф. Гегель. – М.: Государств. социально-экономич. изд-во, 1968. – Т. 1. – 369 с.
2. Калеснік, У.А. Багдановічава калакагатыя (М. Багдановіч – стваральнік і вартаўнік духоўнай скарбніцы беларускага Адраджэння) / У.А. Калеснік // Веснік Брэсцкага універсітэта. – 1999. – № 5. – С. 7–11.
3. Лойка, А.А. Паэт нараджаецца не аднойчы / А.А. Лойка // Багдановіч, М.А. Поўны збор твораў: у 3 т. / М.А. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991 – 1995.
4. Калеснік, У.А. Паэтаў лёс і воля–вольніца / У.А. Калеснік // Полымя. – 1994. – № 12. – С. 211–227.
5. Калеснік, У.А. Зорны спеў: Літ. партрэты. нарысы, эцюды / У.А. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1975. – 400 с.
6. Мельнікава, З.П. «Крылатаму суджана збыцца» (пра творчасць М. Пракаповіча) / З.П. Мельнікава // Полымя. – 1998. – № 11. – С. 286–294.
7. Ляшук, В.Я., Снітко, Г.М. Літаратура Берасцейшчыны / В.Я.Ляшук, Г.М. Снітко. – Брэст: Выдавецтва С. Лаўрова, 1999.– 376 с.
8. Кісялёў, Г.В. Рыцар свабоды / Г.В. Кісялёў // Каліноўскі К. За нашую вольнасць: Творы, дакументы / К. Каліноўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. – С. 7–24.
9. Багдановіч, М.А. Поўны збор твораў: у 3 т. / М.А. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991–1995.
10. Лойка, А.А. Дзеля чаго існуе Адраджэнне? / А.А. Лойка // Адраджэнне: Гіст. альманах. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – Вып. 1. - С. 82–93.
11. Лойка, А.А. Максім Багдановіч: манаграфія / А.А. Лойка. – Мінск: Навука і тэхніка. – 1966. – 335 с.
12. Затонский, Д.В. Постмодернизм в историческом интерьере / Д.В. Затонский // Вопросы литературы. – 1996. – Май–июнь. – С. 182–206.


*Материал поступил в редакцию 25.10.09*

**BORSUK N.N. A conception of a personality and the society (based on the creation of N. Prokopovich)**

The article presents N. Prokopovich' s work as a phenomena of spiritual and intellectual life of the society. A conceptional analysis of the poetry of a bright representative of philosophic trend in the aspect of a man and the society relation is made. The innovation of N. Prokopovich's ideas is revealed in the context of creative works made by M.Bogdanovich and countrymen poets. The results of research are important for the further investigation of the evolution of national poetic tradition.